**В.М. Бігеза,** *дацэнт,*
**С.В. Зыгмантовіч,** *дацэнт*

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ЯК КАМПАНЕНТ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ

Выкладанне ў ВНУ сёння заключаецца не толькі ў прадастаўленні кожнаму студэнту структураванай, мэтанакіраванай і матываванай інфармацыі аб паняційна-метадалагічным змесце пэўнай вучэбнай дысцыпліны, спосабах дзейнасці і галінах выкарыстання ведаў, якія прадбачацца ў будучай прафесіі. Не менш важна кіраваць (прама і ўскосна) самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў па авалоданні ведамі і ўменнямі ў адпаведнасці з пастаўленымі задачамі, фармулюючы пры гэтым мэты навучання і спосабы праверкі ступені іх дасягнення кожным навучэнцам.

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ВНУ вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі да выпускніка, неабходнасцю павышэння якасці адукацыі і адначасова змяншэння часу, энерга- і працазатрат выкладчыка і студэнта на падрыхтоўку да традыцыйных лекцыйных, семінарскіх, практычных і іншых заняткаў, патрабаваннямі да ўваходжання ў сусветную адукацыйную прастору. Усё гэта ўплывае на вызначэнне статусу самастойнай работы студэнтаў як абавязковага базавага складальніка прафесійнай падрыхтоўкі.

Праблеме арганізацыі самастойнай работы студэнтаў прысвечаны педагагічныя даследаванні шэрага навукоўцаў (С.І. Архангельскі, С.М. Васілеўскі, І.П. Гапонаў, М.Р. Гаруноў, Я.Д. Грыгаровіч, Н.В. Драздова, В.Л. Жук, С.І. Зіноўеў, Н.Д. Іванова, С.І. Копцава, А.П. Лабанаў, А.В. Макараў, І.Л. Навумчанка, П.І. Підкасісты, У.А. Сласценін, І.І. Цыркун і інш.).

Спецыялісты ў галіне педагогікі выдзяляюць сёння два ўзроўні самастойнай работы: кіруемая выкладчыкам самастойная работа студэнтаў і ўласна самастойная работа. Кіруемая самастойная работа студэнтаў – такі від дзейнасці, нараўне з лекцыямі і семінарскімі заняткамі, у працэсе якога студэнт кіруецца спецыяльнымі метадалагічнымі ўказаннямі выкладчыка, набывае і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдасканальвае веды, уменні, навыкі, назапашвае вопыт практычнай дзейнасці; гэта асобым чынам арганізаваная мэтанакіраваная дзейнасць выкладчыка і студэнта. Кіруемую самастойную работу трэба разглядаць як абавязковы від дзейнасці выкладчыка поруч з аўдыторнымі заняткамі, тэхналагічна прадумана пабудаваны і адпаведным чынам забяспечаны.

Для эфектыўнага ажыццяўлення гэтага віду дзейнасці неабходны гатоўнасць прафесарска-выкладчыцкага складу, адпаведнае вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Мяркуем, кіруемая самастойная работа паўнацэнна можа ўводзіцца і ажыццяўляцца ў тым выпадку, калі вучэбны курс забяспечаны неабходнымі вучэбнымі крыніцамі. У залежнасці ад гэтага павінна вар'іравацца доля зніжэння аўдыторнай нагрузкі. Дадатковымі крытэрыямі, па якіх вызначаецца яе аб'ём, могуць выступаць: месца прадмета ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў, складанасць і яго аб'ём, колькасць індывідуальных заняткаў, курс, на якім выкладаецца дысцыпліна.

Павелічэнне часу на пазааўдыторную самастойную работу патрабуе вырашэння вынікаючых адсюль праблем: вызначэнне тэм, якія накіраваны на фарміраванне кампетэнцыі спецыяліста, правільная арганізацыя самастойнай работы, кантроль і кіраўніцтва ёю, стварэнне адпаведных умоў для яе здзяйснення. Падаецца, што менавіта вызначэнне тэм з'яўляецца важным пры планаванні самастойнай работы з улікам такіх крытэрыяў, як адпаведнасць прафесійнай арыентаванасці, садзейнічанне фарміраванню і замацаванню ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для будучай прафесійнай дзейнасці, узровень даступнасці вучэбнага матэрыялу для самастойнага вывучэння, забяспечанасць тэм вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай, узровень падрыхтаванасці студэнтаў для працы з такой літаратурай.

Пры вызначэнні тэм, што выносяцца на самастойную работу, мы выкарыстоўваем блочна-модульны падыход. Вызначаюцца тэмы, па якіх не чытаюцца лекцыі ў межах розных модуляў (буйных блокаў праграмы, кожны з якіх змяшчае раздзелы вывучаемага курса), і яны прапануюцца для самастойнага засваення. Акрамя рэкамендуемай літаратуры па такіх тэмах, студэнтам прапануюцца машынапісныя тэксты лекцый, дыдактычныя матэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БІБЛІЯТЭКА
Бела... дзяржаўнага універсі-

З выкарыстаннем указанага падыходу вызначаюцца намі і формы бягучага, прамежкавага або выніковага кантролю. Спецыфіка выкладання бібліяграфічных дысцыплін (аднаўленне зместу, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій і інш.), выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы кантролю актуалізуюць праблему сістэматычнага перагляду тэматыкі, зместу, формаў арганізацыі кантралюемай самастойнай работы.

Бясспрэчна, у пераліку крыніц вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай работы важная роля належыць вучэбна-метадычным комплексам. У спецыяльнай педагагічнай літаратуры яны вызначаюцца як аптымальны сродак, які садзейнічае цэласнасці вучэбнага працэсу ў сукупнасці ўсіх яго складальнікаў. Падкрэслім, што пры гэтым галоўным прызначэннем вучэбна-метадычнага комплексу як сукупнасці ўзаемазвязаных дыдактычных сродкаў навучання выступае забеспячэнне самастойнай работы студэнта.

Усе бібліяграфазнаўчыя дысцыпліны факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый забяспечаны традыцыйнымі і электроннымі вучэбна-метадычнымі комплексамі, якія пабудаваны на аснове блочна-модульнага падыходу і, акрамя вядомых структурных элементаў, уключаюць тэксты лекцый курса, комплекс апорных метадычных матэрыялаў, тэсты для самаправеркі ведаў, метадычныя ўказанні па розных відах вучэбнай, вучэбна-даследчай і самастойнай работы, крытэрыі і балы рэйтынгавай сістэмы ацэнкі вучэбнай дзейнасці.

Значнасць і неабходнасць эфектыўнай арганізацыі самастойнай работы патрабуе яе ўдасканалення, распрацоўкі і ўкаранення заданняў, якія носяць творчы характар, з'яўляюцца дыферэнцыраванымі па ступені складанасці, напрыклад пытанні па тэме, абавязковыя для вывучэння ўсімі студэнтамі і для больш паглыбленага вывучэння або навукова-даследчай работы.

Таксама важным аспектам самастойнай работы з'яўляецца яе індывідуалізацыя, якая патрабуе ад выкладчыка вызначэння ўзроўню інфармацыйнай культуры студэнта, рэгулярнасці кансультацый і адначасова ў значнай ступені дазваляе вызначыць псіхолага-педагагічныя асаблівасці з мэтай стварэння аптымальных умоў для творчага развіцця асобы будучага спецыяліста. Намі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадугледжаны правядзенне калёквіумаў, выкананне пошукавых заданняў на падставе традыцыйных крыніц і Internet-рэсурсаў, падрыхтоўка дакладаў і рэфератаў па выніках знаёмства з неапублікаванымі крыніцамі бібліяграфічнай дзейнасці і распрацоўка тэстаў да іх, вывучэнне перадавога вопыту бібліятэк, пошук дэманстрацыйных дыдактычных матэрыялаў па Internet, якія могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе.

Калектыўная пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў пры вывучэнні бібліяграфазнаўчых дысцыплін накіравана на фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі і прадугледжвае выкананне распрацаваных намі заданняў, якія набліжаюць студэнта да рэальных умоў прафесійнай дзейнасці, напрыклад, падрыхтоўка групай дзелавых гульняў: “Дзень спецыяліста”, “Дзень бібліяграфіі”, “Навукова-практычная канферэнцыя супрацоўнікаў дзіцячых бібліятэк”, распрацоўка сцэнарыяў, прэзентацый у Power Point, вывучэнне бібліяграфічных патрэбнасцей канкрэтных чытацкіх груп, падрыхтоўка комплекснага мерапрыемства “Тыдні школьных прадметаў” і інш.

Кіруемая самастойная работа можа быць эфектыўнай толькі пры сістэматычным яе кантролі. Пытанне арганізацыі кантролю вельмі тонкае і супярэчлівае. З аднаго боку, кантроль як быццам аслабляе, зніжае самастойнасць, а з другога – неабходны для павышэння яе эфектыўнасці. Таму канкрэтныя формы і метады кантролю павінны быць путкімі, прадуманымі. Намі выкарыстоўваюцца разнастайныя формы кантролю: апытанне на лабараторных занятках, заслухоўванне дакладаў на семінарах, праверка канспекта, рэфератаў, правядзенне круглага стала з абмеркаваннем сцэнарыяў, рэфератаў, гутарка па пэўных тэмах курса, праверка вынікаў выканання пошукавых заданняў, аналіз распрацаваных сцэнарыяў, тэст-апытанне, абарона курсавых і дыпломных работ, самакантроль студэнтаў. Распрацоўваюцца тэсты па ўсіх модулях, яны змяшчаюцца ў электроннай бібліятэцы і выкарыстоўваюцца студэнтамі для самакантролю.

Важнае значэнне мае так званы матывацыйны фактар кантролю. Студэнт павінен заахвочвацца за поспехі ў вучобе, творчы падыход да выканання заданняў як маральна, так і матэрыяльна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для вызначэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы намі было праведзена анкетаванне студэнтаў 3 курса факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (48 студэнтаў). Па сутнасці, вынікі гэтага анкетавання – своеасаблівы паказчык адваротнай сувязі ў вучэбным працэсе, ацэнка работы па кіраванні самастойнай работай самімі студэнтамі, вынік сацыяльнай эфектыўнасці азначанага кірунку ў навучанні.

На пытанне анкеты: "Ці згодны Вы з тым, што кіруемая самастойная работа неабходна ў вучэбным працэсе нашага факультэта?" – 72% студэнтаў далі станоўчы адказ, а на пытанне: "Якія віды самастойнай работы Вы вылучаеце з прапанаваных выкладчыкамі?" – падрыхтоўку да тэставага кантролю адзначылі 65%, і абсалютная большасць – 83% – адзначылі падрыхтоўку творчых заданняў (прэзентацыі, праекты). На пытанне: "Якімі ўменнямі і навыкамі самастойнай работы з кнігай Вы валодаеце ў дастатковай ступені?" – 84% назвалі канспектаванне, 68% – падрыхтоўку рэфератаў, аглядаў, і толькі 31% – паглыбленае вывучэнне дакументных крыніц. Сярод формаў вучэбнай дзейнасці, якія ў найбольшай ступені ўплываюць на прафесійнае станаўленне, як аказалася, для студэнтаў амаль аднолькава важнымі з'яўляюцца і формы аўдыторнай работы (48%), і пазааўдыторнай самастойнай работы (52%). Сярод найбольш камфортных месцаў выканання самастойнай работы лідзіруюць хатнія ўмовы, затым Internet, электронная бібліятэка, 5 студэнтаў назвалі вучэбныя лабараторыі кафедры.

Такім чынам, павелічэнне аб'ёму самастойнай работы з'яўляецца сёння пазітыўнай тэндэнцыяй у вышэйшай адукацыі і звязана з задачай навучыць бесперапынна вучыцца і развівацца самастойна ў прафесійным і асобасным кірунках. Аналіз стану самастойнай работы пры вывучэнні бібліяграфазнаўчых дысцыплін дазваляе выказаць меркаванне аб неабходнасці комплексу ўмоў, якія садзейнічаюць эфектыўнасці самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

На наш погляд, неабходна нарматыўная база на ўзроўні універсітэта, якая вызначае парадак планавання і аб'ём часу на самастойную работу з адпаведнай адаптацыяй да ўмоў кожнага факультэта. Лічым слушным (поруч з канспектамі лекцый, вучэбна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадычнымі комплексамі, вучэбнымі дапаможнікамі і іншымі традыцыйнымі матэрыяламі) пашырэнне выкарыстання іх электронных версій для доступу ў хатніх умовах. Неабходны новыя пакаленні аўтаматызаваных навучальных і кантралюючых сістэм, якія дазваляюць студэнту ў зручны час і ў прывычным для яго тэмпе самастойна набываць веды і ўменні, а таксама забяспечанасць множыльнай тэхнікай, даступнай для выкладчыкаў і студэнтаў. Бясспрэчнай неабходнасцю з'яўляецца ўдасканаленне сістэмы інфармацыйных камунікацый ва універсітэце, якія адкрываюць доступ да найноўшых дасягненняў у галіне культуры і мастацтваў.

І, безумоўна, якасць самастойнай работы як часткі адукацыі самым непасрэдным чынам залежыць ад асобасных характарыстык навучэнцаў. Тут вялікую ролю адыгрываюць матывацыя ў выбары факультэта, спецыяльнасці, спецыялізацыі, інтэлектуальны патэнцыял студэнта і іншыя фактары. Гэтая акалічнасць вымагае грунтоўнай работы з боку выкладчыкаў факультэта ўжо на этапе прафесійнай арыентацыі абітурыентаў, менавіта яна ў пэўнай ступені будзе садзейнічаць фарміраванню так званай унутранай матывацыі, якая дазволіць вызначыць схільнасці студэнта, яго здольнасці да навучання па пэўнай спецыяльнасці.

**Т.П. Бируля**, *преподаватель*,
**С.Г. Безмен**, *преподаватель*

## САМОСТОЯТЕЛЬНАЯ РАБОТА СТУДЕНТОВ КАК ОДИН ИЗ ФАКТОРОВ ИНТЕНСИФИКАЦИИ ПРОЦЕССА ОБУЧЕНИЯ ИНОСТРАННОМУ ЯЗЫКУ

При сравнительно небольшом количестве аудиторных часов, отведенных на изучение иностранного языка в неязыковом вузе, и высоких требованиях к уровню языковой подготовки будущих специалистов самостоятельная работа студентов призвана стать одной из ведущих форм обучения. Самостоятельная работа исключительно важна для студента как в психологическом, так и дидактическом плане. Достаточно сильной мотивацией сегодня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ